Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
(назва вышэйшай навучальнай установы)

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ
Данільчанка А.В.
(подпіс) (Прозвішча)
30.06.2013
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-____/р.

**Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст.**
(назва вучэбнай дысцыпліны)

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці:**
1-210504 **славянская філалогія**
(код спецыяльнасці) (назва спецыяльнасці)

Факультэт філалагічны
(назва факультэта)

Кафедра гісторыі беларускай літаратуры
(назва кафедры)

Курс (курсы) II

Семестр (семестры) II

Лекцыі 32 (колькасць гадзін)
Экзамен ____ (семестр)

Практычныя (семінарскія) заняткі 8 (колькасць гадзін)
Залік II (семестр)

УСР 8 (колькасць гадзін)
Курсавы праект (работа) ____

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне 48

Усяго гадзін па дысцыпліне 74 (колькасць гадзін)

Форма атрымання вышэйшай адукацыі стацыянар

Склала: ст.выкл. Крычко В.П.

2013 г.

№ уліку – 144

Вучэбная праграма складзена на аснове Тыпавой вучэбнай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў "Гісторыя беларускай літаратуры: XI–XIX стагоддзі". – Мінск, 2011. Зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйны № ТД-Д.140/тып.

(назва тыпавой вучэбнай праграмы ), дата зацвярджэння, рэгістрацыйны нумар)

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на паседжанні кафедры гісторыі беларускай літаратуры

(назва кафедры)

28.05.2013 г. Пратакол № 10

(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры

_______________ Казакова Т.П.

(подпіс) (Прозвішча)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта

30.05.2013 г. Пратакол № 6

(дата, нумар пратакола)

Старшыня

_______________ Хмяльніцкі М.М.

(подпіс) (Прозвішча)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя беларускай літаратуры (XI–XIX стагоддзі) – адна з важных частак агульнага курса гісторыі беларускай літаратуры. У гісторыі беларускай літаратуры вылучаюцца два буйныя перыяды, згодна з якімі Гісторыя беларускай літаратуры XI-XVII ст. – першая частка курса гісторыі беларускай літаратуры XI –XIX стагоддзяў – прысвечана разгляду літаратуры Беларусі Сярэднявечча, Рэнесансу і Барока. Яна выконвае такія асноўныя задачы, як: сфарміраваць у студэнтаў уяўленне пра полілінгвістычны характар даўняй беларускай літаратуры, спецыфіку развіцця беларускай літаратуры XI-XVII ст., пра асноўныя гісторыка-культурныя эпохі, а таксама спрыяць выпрацоўцы навыкаў літаратуразнаўчага аналізу тэкстаў помнікаў на старaславянскай і старабеларускай мовах. Студэнту неабходна ведаць асаблівасці літаратурнага працэсу Беларусі ў XI-XVII ст., жанры і стылі старабеларускай літаратуры, творчыя біяграфіі яе важнейшых прадстаўнікоў, гісторыю стварэння і асаблівасці паэтыкі найбольш значных мастацкіх твораў. Студэнты павінны ўмець аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце. Асаблівая ўвага надаецца старабеларускай літаратуры XVI-XVII ст., якая развівалася ў складзе поліэтнічных і поліканфесійных дзяржаўных утварэнняў (спачатку ВКЛ, а потым Рэчы Паспалітай) у цеснай сувязі з рэлігійнымі і нацыянальна-культурнымі рухамі (Рэфармацыяй і Контррэфармацыяй).

Літаратурная спадчына Беларусі XI-XVII ст., як арганічны складнік нацыянальнай культуры, дапамагае студэнтам глыбока засвоіць культурныя традыцыі, спазнаць сваё гістарычнае мінулае і ўключыць лепшыя здабыткі айчыннай культуры ў свой духоўны актыў, зрабіць іх фактарам актуальнага культурна-гістарычнага жыцця.

Гісторыя беларускай літаратуры XVIII – XIX стст., паводле сучаснай перыядызацыі, вызначаецца як перыяд Новай беларускай літаратуры, які храналагічна працягваў перыяд Даўняй беларускай літаратуры (XI – XVII стст.). У ідэйна-эстэтычным плане акрэслены перыяд захоўвае ў сабе яшчэ тэндэнцыі барока (да сярэдзіны XVIII ст.), якія плаўна змяняюцца асветніцкімі, а затым, у XIX ст., літаратура перажывае рух ад рамантызму да рэалізму і тэндэнцый мадэрну. Пры гэтым творчасць многіх пісьменнікаў (В.Дунін-Марцінкевіча, У.Сыракомлі, Я.Лучыны і інш.) спалучае ў сабе адзнакі розных мастацкіх стыляў (сентыменталізму, рамантызму, рэалізму). Важнай асаблівасцю айчыннай літаратуры двух адзначаных стагоддзяў з'яўляецца і тое, што яна працягвае заставацца шматмоўнай: яе абслугоўваюць пераважна польская мова, мова беларуская і латынь.

У дадзеным курсе лекцый звяртаецца асаблівая ўвага на грамадска-гістарычныя, культурныя і эстэтычныя асаблівасці развіцця літаратуры ў XVIII і XIX стст., без чаго немагчыма адэкватна разумець як літаратурны працэс у цэлым, так і мастацкую спецыфіку асобных твораў і творчых індывідуальнасцяў, у прыватнасці. Так, неабходна акцэнтаваць увагу студэнтаў на кардынальнай адрознасці гістарычнага аблічча абодвух стагоддзяў, што фарміравала абсалютную адрознасць творчых парадыгмаў: у XVIII ст. літаратура Беларусі развіваецца у межах самастойнай еўрапейскай дзяржавы Рэчы Паспалітай і яе аблічча вызначае сармацкі комплекс ідэйных, грамадскіх і культурных каштоўнасцяў уключна з прывеліяваным становішчам польскай мовы, якая пераважна і была мовай айчыннай літаратуры. Але пасля трагічнага трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Беларусь апынулася ў складзе Расійскай імперыі, што прадвызначыла нацыянальна-вызваленчую барацьбу і адпаведны пафас усёй беларускай літаратуры XIX ст.

У гэты ж час асаблівай вастрыні дасягае пытанне вызвалення сялян, пастаўленае ў літаратуры яшчэ асветнікамі, і творы літаратуры асаблівым чынам спалучаюць у сабе дзве ідэйныя дамінанты: нацыянальна-вызваленчую (патрыятычную) і сацыяльна-класавую (сялянскую). У змененых гістарычных акалічнасцях, асабліва ў сувязі з актывізацыяй нацыянальна-вызваленчай барацьбы паўсюдна ў славянскіх краінах, надзвычайна павышаецца статус беларускай мовы і з'яўляецца шэраг пісьменнікаў, якія заяўляюць сябе як пісьменнікі беларускія, што пішуць па-беларуску і для беларусаў (сялян і дробнай шляхты), аднак не парываюць яшчэ з традыцыяй былой шляхецка-элітарнай польскамоўнасці (Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, Я. Лучына, Ф. Багушэвіч, З. Манькоўская і інш.).

Яскравай асаблівасцю беларускай літаратуры XIX ст. з'яўляецца таксама наяўнасць у ёй шматлікай колькасці ананімных і напісаных пад псеўданімамі твораў парадыйнай, этнаграфічна-патрыятычнай і агітацыйна-прапагандысцкай тэматыкі (паэмы "Энеіда навыварат" В.Равінскага, "Мачаха" Адэлі з Устроні, "Тарас на Парнасе" К.Вераніцына, а таксама цэлы пласт асаблівага вершаванага жанру "гутарак" – "Гутарка старога дзеда", "Гутарка двух суседаў", Гутарка Данілы са Сцяпанам" і інш.).

Мэта курса – даць аптымальны аб'ём ведаў па гісторыі беларускай літаратуры XI–XIX стст., спрыяць далейшай выпрацоўцы навыкаў прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу; сфарміраваць у студэнтаў-філолагаў сістэму прафесійных ведаў і уменняў, што забяспечыць самастойную творчую дзейнасць настаўніка-славесніка.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

| № п/п | Назвы раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Аўдыторныя | | | | Самаст. работа |
| | | Лекцыі | Практыч. | Лаб. занят. | КСР | |
| 1. | **Уводзіны** | **2** | | | | |
| 2. | Гісторыка-культурны феномен старабеларускай літаратуры<br>1. Спецыфічныя асаблівасці<br>2. Сістэма жанраў<br>3. Перыядызацыя<br>4. Асноўныя этапы вывучэння | 2 | | | | Праверка канспектаў<br>1 |
| 3. | **Літаратура ранняга Сярэднявечча** | **2** | **2** | | **2** | |
| 4. | Перакладная літаратура:<br>1. Біблійная традыцыя на Беларусі<br>2. Беларуская рэдакцыя апокрыфа "Блуканне Багародзіцы па пакутах"<br>Арыгінальная літаратура:<br>1. Дыдактычнае красамоўства Клімента Смаляціча<br>2. Усходнеславянскае летапісанне<br>3. Жанрава-стылёвыя асаблівасці "Хаджэння ў Царград" Ігнація Смаляніна<br>4. "Слова пра паход Ігара" і Беларусь | 2 | | | | Праверка канспектаў<br>1 |
| 5. | Урачыстае красамоўства Кірыла Тураўскага | | 2 | | | Праверка літ. дзённікаў 1 |
| 6. | Старабеларуская агіяграфія XII-XIII стст. ("Жыціе Еўфрасінні Полацкай", "Жыціе Аўраамія Смаленскага") | | | | 2 | Кам-п'ют. тэсціраванне |
| 7. | **Літаратура позняга Сярэднявечча** | **4** | **2** | | | |
| 8. | Агульнадзяржаўнае беларуска-літоўскае летапісанне<br>1. Спецыфічныя асаблівасці летапісання ў ВКЛ<br>2. Падзеі ранняга перыяду гісторыі ВКЛ у Галіцка-Валынскім летапісе<br>3. Структура і сінкрэтызм "Летапісца вялікіх князёў літоўскіх"<br>4. Характарыстыка "Беларуска-літоўскага летапісу 1430-1446 гг."<br>5. Жанрава-стылёвыя асаблівасці "Пахвалы Вітаўту" | 2 | 2 | | | Праверка літаратурных дзённікаў<br>1 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9. | Урачыстае красамоўства Грыгорыя Цамблака<br>1. Грамадская і літаратурная дзейнасць мітрапаліта ў ВКЛ<br>2. Экспрэсіўна-эмацыянальны стыль Слоў Грыгорыя Цамблака | 2 | | | | Сумоўе |
| 10. | **Літаратура эпохі Рэнесансу** | **4** | **2** | | | |
| 11. | Літаратура ранняга Рэнесансу<br>1. Новалацінская паэзія (М.Гусоўскі, Я.Вісліцкі)<br>2. Рэфармацыя ў Беларусі (С.Будны, В.Цяпінскі)<br>Літаратура позняга Рэнесансу<br>1. Старабеларуская паэзія<br>2. Жанр эпікграмы<br>3. Мемуарная літаратура<br>4. Перакладны рыцарскі раман | 4 | | | | Праве-рка канспе-ктаў |
| 12. | Прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны | | 2 | | | Праве-рка літ. дзённі-каў |
| 13. | **Літаратура эпохі Барока** | **4** | | | | |
| 14. | Барока ў беларускай літаратуры<br>1. Контррэфармацыя ў Беларусі<br>2. Рэлігійна-палемічная публіцы-стыка<br>3. Паэтыка “Трэнаса” М.Сматрыц-кага<br>4. Парадыйна-сатырычная літара-тура<br>5. Школьная драма і інтэрмедыі<br>6. Сімяон Полацкі: беларускі перыяд творчасці | 4 | | | | Вуснае апытан-не |
| 15. | **Літаратура XVIII ст.** | **4** | | | **2** | |
| 16. | 1. Мясцовае летапісанне (“Магілёўская хроніка”)<br>2. Мемуарная літаратура (С. Пільштынова “Авантуры майго жыцця”)<br>3. Беларускамоўная паэзія XVIII ст.<br>4. Драматургія XVIII ст. (“Камедыя” К. Марашэўскага) | 4 | | | | Правер-ка канспе-ктаў |
| 17. | Творчасць Ф. У. Радзівіл | | | | 2 | Пісьм. апытан-не |
| 18. | **Літаратура перш. пал. XIX ст.** | **6** | **2** | | **2** | |
| 19. | Асоба і творчасць А. Міцкевіча | 2 | 2 | | | Вуснае апытан-не |
| 20. | Творчасць пісьменнікаў-філаматаў (Т.Зан, А.Э.Адынец, А.Ходзька) | | | | 2 | тэсціраванне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 21. | 1. Жыццё і творчасць Яна Чачота<br>2. Асоба і творчасць Яна Баршчэўскага (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”)<br>3. Беларуская паэзія сярэдзіны XIX ст. (верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы”) | 4 | | | | Праверка літ. дзённікаў |
| 22. | **Літаратура др. пал. XIX ст.** | **6** | | | **2** | |
| 23. | Паэма “Тарас на Парнасе” ў беларускім літаратуразнаўстве | | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 24. | 1. Паэма “Энеіда навыварат” у беларускім літаратуразнаўстве<br>2. Жыццёвы і творчы шлях У.Сыракомлі<br>3. Кастусь Каліноўскі: асоба і публіцыстыка<br>4. Асоба і творчасць Я. Лучыны (паэма “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”) | 2 | | | | сумоўе |
| 25. | Драматургія Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча | 2 | | | | Праверка канспектаў |
| 26. | Паэзія Францішка Багушэвіча | 2 | | | | Праверка літ. дзённікаў |
| | Усяго: | **32** | **8** | | **8** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## Асноўная і дадатковая літаратура

| №№ п/п | Спіс літаратуры | Год выдання |
|---|---|---|
| | ***Асноўная*** | |
| 1. | Адам Міцкевіч і Беларусь. | 1998 |
| 2. | Александровіч С., Александровіч В. Беларуская літаратура XIX – пачатку XX ст.: Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў. | 1976 |
| 3. | Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. | 2003 |
| 4. | Беларуская літаратура XVIII–XIX ст.: Зборнік тэкстаў. | 2000 |
| 5. | Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. | 1988 |
| 6. | Беларускія летанісы і хронікі. | 1997 |
| 7. | Бурдзялёва І.А. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў: майстры, плыні, традыцыі: Курс лекцый | 2009 |
| 8. | Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стст. У 2 т. Т. 2: Новая беларуская літаратура | 2007 |
| 9. | Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў: У 2 т. Т.1. Даўняя літаратура: XI-першая палова XVIII стагоддзя. | 2006 |
| 10. | Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд / Пад рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. | 1998 |
| 11. | Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст. 2-е выд., дапрац. | 1998 |
| 12. | Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя / Уклад У.Казберука | 2001 |
| 13. | Запрудскі І.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX ст. | 2003 |
| 14. | Каваленка В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць | 1975 |
| 15. | Кісялёў Г. Ад Чачота да Багушэвіча | 1993; 2003 |
| 16. | Кісялёў Г. Сейбіты вечнага | 2009 |
| 17. | Кніга жыццій і хаджэнняў / Уклад. А.А. Мельнікаў. | 1994 |
| 18. | Літаратура Беларусі: першая палова XIX стагоддзя. Хрэстаматыя / Уклад. К.Цвірка | 2000 |
| 19. | Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: У 2 ч. 2-е выд., дапрац. і дап. Ч. I. | 1989 |
| 20. | Лойка А.А. Старабеларуская літаратура. | 2001 |
| 21. | Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянских традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду: другая палавіна XVII–XVIII ст. | 1980 |
| 22. | Мархель У.І. Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. | 1991 |
| 23. | Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. | 1992 |

| | | |
|---|---|---|
| 24. | Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX стагоддзя | 1977; 2003 |
| 25. | Старажытная беларуская літаратура (XII-XVII стст.) / Уклад., прадм., камент. I. Саверчанкі. | 2007 |
| 26. | Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. | 2002 |
| 27. | Хаўстовіч М. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гг. XIX ст. | 2001 |
| 28. | Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / Уклад. А.Ф. Коршунаў. | 1959 |
| 29. | Штэйнер І.Ф. Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя. | 2002 |
| 30. | Янушкевіч Я. Беларускі Дудар. | 1991 |
| | *Дадатковая літаратура* | |
| 31. | Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна: На лац. і бел.мовах / Укл., перакл., камент. Ж.В.Некрашэвіч-Кароткай. | 2005 |
| 32. | Багдановіч І.Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. | 2001 |
| 33. | Бразгуноў А.У. Перакладная белетрыстыка Беларусі XV-XVII ст. | 2007 |
| 34. | Булахаў М.Г. “Слова пра паход Ігаравы” і Беларусь У 2 ч. | 2000 |
| 35. | Гаранін С.Л. Шляхамі даўніх вандраванняў. Гістарычна-тэарэтычны нарыс развіцця беларускай паломніцкай літаратуры XII-XVI стст. | 2000 |
| 36. | Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI века. | 1979 |
| 37. | Каваленка В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. | 1981 |
| 38. | Кавалёў С.В. Гісторыя беларускай літаратуры: др.пал. XVI ст.: курс лекцый. | 2005 |
| 39. | Кавалёў С.В. Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу. | 2002 |
| 40. | Казакова Т.П. Грыгорый Цамблак: царкоўны дзеяч і пісьменнік | 2008 |
| 41. | Кісялёў Г. Жылі-былі класікі. | 2005 |
| 42. | Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. | 1963 |
| 43. | Короткий В.Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого. | 1987 |
| 44. | Лазарук М.А. Станаўленне беларускай паэмы: Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX ст. | 1968 |
| 45. | Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў. | 1982 |
| 46. | Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. | 1969 |
| 47. | Мархель У. “Ты як здароўе…”: Адам Міцкевіч і тэндэнцыі адраджэння беларускай літаратуры. | 1998 |
| 48. | Мархель У. Вяшчун славы і волі: Уладзіслаў Сыракомля. | 1989 |
| 49. | Мельнікаў А.А. З неапублікаванай спадчыны. | 2005 |
| 50. | Некрашэвіч-Кароткая Ж. В. Беларуская лацінамоўная | 2009 |

| | | |
|---|---|---|
| | паэзія: ранні Рэнесанс. | |
| 51. | Порецкий Я.И. Николай Гусовский. | 1984 |
| 52. | Саверчанка І.В. Старажытная паэзія Беларусі: XVI-першая палова XVII ст. | 1992 |
| 53. | Саверчанка І.В. Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар. | 1993 |
| 54. | Содаль У. Сцежкамі Мацея Бурачка. | 1991 |
| 55. | Тарасюк Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX – пачатку XX ст. | 1999 |
| 56. | Трацяк І.І. Біблія ў кантэксце беларускай культуры. | 2003 |
| 57. | Францыск Скарыша і яго час: Энцыклапедычны даведнік. | 1988 |
| 58. | XIX стагоддзе: Навукова-літаратурны альманах. Кн. першая; кн. другая /Уклад. М. Хаўстовіч. | 1999; 2000 |
| 59. | Чамярыцкі В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. | 1969 |
| 60. | Янушкевіч Я. За архіўным парогам. | 2002 |
| 61. | Скарына Ф. Выбраныя творы / Уклад., прадм., пер. на бел. мову І.В. Саверчанкі. Мінск, 2008. | 2008 |
| 62. | Некрашэвіч-Кароткая Ж. В. Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока. Мінск, 2011. | 2011 |
| 63. | Літаратура XI—XVI стагоддзяў : зборнік. Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. (Залатая калекцыя беларускай літаратуры ; т. 1). | 2011 |
| 64. | Літаратура XVII—XVIII стагоддзяў : зборнік. Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. (Залатая калекцыя беларускай літаратуры ; т. 2). | 2012 |
| 65. | Запрудскі І. М. Па дарозе на Парнас: атрыбуцыйныя даследаванні і пытанні рэцэпцыі беларускай літаратуры XIX ст.: Зборнік навуковых артыкулаў. Выдавецтва БДУ, 2012. | 2012 |

## ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

1. Творчасць Кірыла Тураўскага.
2. Беларуска-літоўскія летапісы XV-XVI ст.
3. Прадмовы і пасляслоўі Ф.Скарыны.
4. Паэма “Дзяды” А. Міцкевіча як нацыянальная рамантычная драма.

## ТЭМАТЫКА КСР

1 Агіяграфічная літаратура Беларусі XII-XIII стст.
2 Творчасць філаматаў і філарэтаў.
3 Творчасць Ф.У. Радзівіл.
4 Паэма “Тарас на Парнасе” ў беларускім літаратуразнаўстве.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў, якія вывучаюцца на занятках | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XI-XIX стст. (48 г.)** | **32** | **8** | | **8** | | | |
| 1.1. | **Уводзіны (2 г.)** | **2** | | | | | | |
| 1.1.1 | Гісторыка-культурны феномен старабеларускай літаратуры<br>5. Спецыфічныя асаблівасці<br>6. Сістэма жанраў<br>7. Перыядызацыя<br>8. Асноўныя этапы вывучэння | 2 | | | | Камп'ютарная прэзентацыя №1 | [9]<br>[20] | Праверка канспектаў |
| 1.2. | **Літаратура ранняга Сярэднявечча (6 г.)** | **2** | **2** | | **2** | | | |
| 1.2.1 | Перакладная літаратура:<br>3. Біблійная традыцыя на Беларусі<br>4. Беларуская рэдакцыя апокрыфа "Блуканне Багародзіцы па пакутах"<br>Арыгінальная літаратура:<br>5. Дыдактычнае красамоўства Клімента Смаляціча | 2 | | | | Тураў.Тураўскае евангелле. Мн., 2004.<br>Саверчанка І.В. Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998.<br>Нікалаеў М. Гісторыя беларускай кнігі. Т.1. | [33]<br>[34]<br>[35] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Усходнеславянскае летапісанне<br>3. Жанрава-стылёвыя асаблівасці “Хаджэння ў Царград” Ігнація Смаляніна<br>4. “Слова пра паход Ігара” і Беларусь | | | | | Мн., 2010. Фрагменты аўдыёзапісаў радыёперадач “Дыярыуш” (з удзелам В.П.Крычко, мастацкія тэксты чытае А.Вінярскі) | | |
| 1.2.2 | Урачыстае красамоўства Кірыла Тураўскага | | 2 | | | | [50] | Праверка літ.дзённікаў |
| 1.2.3 | Старабеларуская агіяграфія XII-XIII стст. (“Жыціе Еўфрасіпіі Полацкай”, “Жыціе Аўраамія Смаленскага”) | | | | 2 | | [17] | Камп’ют. тэсціраванне |
| 1.3 | **Літаратура позняга Сярэднявечча (6 г.)** | **4** | **2** | | | | | |
| 1.3.1 | Агульнадзяржаўнае беларуска-літоўскае летапісанне<br>1. Спецыфічныя асаблівасці летапісання ў ВКЛ<br>2. Падзеі ранняга перыяду гісторыі ВКЛ у Галіцка-Валынскім летапісе<br>3. Структура і сінкрэтызм “Летапісца вялікіх князёў літоўскіх”<br>4. Характарыстыка “Беларуска-літоўскага летапісу 1430-1446 гг.”<br>5. Жанрава-стылёвыя асаблівасці “Пахвалы Вітаўту” | 2 | 2 | | | Гравюрныя партрэты вялікіх літоўскіх князёў | [60]<br>[6] | Праверка літаратурных дзённікаў |
| 1.3.2 | Урачыстае красамоўства Грыгорыя Цамблака | 2 | | | | Казакова Т.П. Грыгорый | [41] | Сумоўе |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Грамадская і літаратурная дзейнасць мітрапаліта ў ВКЛ<br>2. Экспрэсіўна-эмацыянальны стыль Слоў Грыгорыя Цамблака | | | | | Цамблак: царкоўны дзеяч і пісьменнік / Т.П.Казакова. – Мінск, 2008. | | |
| 1.4 | **Літаратура эпохі Рэнесансу (6 г.)** | **4** | **2** | | | | | |
| 1.4.1 | Літаратура ранняга Рэнесансу<br>1. Новалацінская паэзія (М.Гусоўскі, Я.Вісліцкі)<br>2. Рэфармацыя ў Беларусі (С.Будны, В.Цяпінскі)<br>Літаратура позняга Рэнесансу<br>1. Старабеларуская паэзія<br>2. Жанр эпікграмы<br>3. Мемуарная літаратура<br>4. Перакладны рыцарскі раман | 4 | | | | Камп'ютарная прэзентацыя №2 Новалацінская паэзія Беларусі<br><br>"Беларускі Трышчан" | [31]<br>[36]<br>[51]<br>[52]<br>[53]<br>[25]<br>[38]<br>[39]<br>[40] | Праверка канспектаў |
| 1.4.2 | Прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны | | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя №3 Кнігадрукі | [58] | Праверка літ. дзённікаў |
| 1.5 | **Літаратура эпохі Барока (4 г.)** | **4** | | | | | | |
| 1.5.1 | Барока ў беларускай літаратуры<br>1. Контррэфармацыя ў Беларусі<br>2. Рэлігійна-палемічная публіцыстыка<br>3. Паэтыка "Трэнаса" М.Сматрыцкага<br>4. Парадыйна-сатырычная літаратура | 4 | | | | С.Полоцкий. Вирши | [44] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Школьная драма і інтэрмедыі<br>6. Сімяон Полацкі: беларускі перыяд творчасці | | | | | | | |
| 1.6 | **Літаратура XVIII ст. (6 г.)** | **4** | | | **2** | | | |
| 1.6.1 | 1. Мясцовае летапісанне (“Магілёўская хроніка”)<br>2. Мемуарная літаратура (С. Пільпітынова “Авантуры майго жыцця”)<br>3. Беларускамоўная паэзія XVIII ст.<br>4. Драматургія XVIII ст. (“Камедыя” К. Марашэўскага) | 4 | | | | Беларускія летапісы і хронікі | [21]<br>[46]<br>[4]<br>[8] | Праверка канспектаў |
| 1.6.2 | Творчасць Ф. У. Радзівіл | | | | 2 | | [9] | Пісьмовае апытанне |
| 1.7 | **Літаратура перш. пал. XIX ст. (10 г.)** | **6** | **2** | | **2** | | | |
| 1.7.1 | Асоба і творчасць А. Міцкевіча | 2 | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя №4 Адам Міцкевіч | [1]<br>[32]<br>[37]<br>[48] | Вуснае апытанне |
| 1.7.2 | Творчасць пісьменнікаў-філаматаў (Т.Зан, А.Э.Адынец, А.Ходзька) | | | | 2 | Філаматы і філарэты | [22]<br>[27]<br>[29] | тэсціраванне |
| 1.7.3 | 1. Жыццё і творчасць Яна Чачота<br>2. Асоба і творчасць Яна Баршчэўскага (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”)<br>3. Беларуская паэзія сярэдзіны | 4 | | | | Працы М. В. Хаўстовіча | [15]<br>[24] | Праверка літ.дзённікаў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | XIX ст. (верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы”) | | | | | | | |
| 1.8 | **Літаратура др. пал. XIX ст. (12 г.)** | **6** | | | **2** | | | |
| 1.8.1 | Паэма “Тарас на Парнасе” ў беларускім літаратуразнаўстве | | | | 2 | Працы Г. Кісялёва | [42] | Пісьмовае апытанне |
| 1.8.2 | 1. Паэма “Энеіда навыварат” у беларускім літаратуразнаўстве<br>2. Жыццёвы і творчы шлях У.Сыракомлі<br>3. Кастусь Каліноўскі: асоба і публіцыстыка<br>4. Асоба і творчасць Я. Лучыны (паэма “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”) | 2 | | | | Камп’ютарная прэзентацыя №5 К. Каліноўскі | [2]<br>[13]<br>[16]<br>[49]<br>[56] | сумоўе |
| 1.8.3 | Драматургія Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча | 2 | | | | Архівы Беларусі | [7]<br>[23]<br>[30] | Праверка канспектаў |
| 1.8.4 | Паэзія Францішка Багушэвіча | 2 | | | | Беларуская вечарына | [13]<br>[55] | Праверка літ.дзённікаў |

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з пазначэннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі | Кафедра гісторыі Беларусі | Узгадніць пытанні перыядызацыі. | |
| Гісторыя рускай літаратуры | Кафедра рускай літаратуры | Помнікі прыгожага пісьменства, створаныя па-за межамі этнічнай тэрыторыі Беларусі, а таксама творы, у якіх не закранаюцца падзеі беларускай гісторыі паглыблена вывучаць у курсе гісторыі рускай літаратуры. | |